НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ
ЦЕНТРАЛЬНАЯ НАУЧНАЯ БИБЛИОТЕКА ИМЕНИ ЯКУБА КОЛАСА

# ТРУДЫ ЦЕНТРАЛЬНОЙ НАУЧНОЙ БИБЛИОТЕКИ НАН БЕЛАРУСИ

Сборник научных сообщений и статей

# ПРАЦЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ НАН БЕЛАРУСІ

Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў

# PROCEEDINGS OF THE CENTRAL SCIENCE LIBRARY OF NAS OF BELARUS

Collection of scientific reports and articles

Выпуск 1 / Issue 1

Минск
«ИВЦ Минфина»
2025

УДК [02+930](082)
ББК 78я43+63.2я42
Т782

Рекомендовано к печати Ученым советом
Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа
Национальной академии наук Беларуси, протокол № 7 от 02.09.2025

Составитель
кандидат педагогических наук, доцент *Ю. А. Переверзева*

Редакционная коллегия:
кандидат исторических наук *С. С. Юрецкий* (главный редактор);
член-корреспондент РАН, доктор исторических наук, профессор
*И. В. Тункина* (заместитель главного редактора); доктор исторических наук,
доцент *В. А. Белозорович* (заместитель главного редактора); доктор исторических наук,
профессор *М. В. Курмаев*; доктор исторических наук, доцент *И. В. Лизунова*;
доктор педагогических наук, профессор *А. М. Мазурицкий*; доктор педагогических
наук, доцент *И. А. Малахова*; доктор педагогических наук, доцент *Л. Г. Тараненко*;
кандидат исторических наук, доцент *Л. Д. Бондарь*; кандидат исторических наук,
доцент *В. В. Врублевский*; кандидат педагогических наук, доцент *Ю. А. Переверзева*;
кандидат педагогических наук *Е. Э. Политевич*; кандидат педагогических наук, доцент
*О. В. Скворцова*; кандидат исторических наук, доцент *К. В. Сытько*

Т782 **Труды** Центральной научной библиотеки НАН Беларуси = Працы Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі = Proceedings of the Central Science Library of NAS of Belarus : сб. науч. собщ. и ст. / НАН Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; редкол.: С. С. Юрецкий (гл. ред.) [и др.] ; сост.: Ю. А. Переверзева. – Минск : ИВЦ Минфина, 2025. – Вып. 1. – 310 с.
ISBN 978-985-880-719-1.

Сборник научных сообщений и статей «Труды Центральной научной библиотеки НАН Беларуси» объединяет исследования, посвященные актуальным направлениям библиотечной науки и практики, историографии, источниковедению и методам исторического исследования. В нем представлены публикации, раскрывающие проблематику, связанную с библиотечным медиаконтентом, цифровой инфраструктурой и управлением информацией, социокультурной миссией библиотек, подготовкой библиотекарей-библиографов; работы по истории и источниковедению Беларуси XIX – первой половины XX вв., а также освещающие вопросы классификации генеалогических материалов, документальные и архивные фонды, религиозные и культурные памятники.

Издание адресовано руководителям и специалистам библиотечно-информационной сферы, историкам, архивистам, преподавателям, исследователям, аспирантам, магистрантам, студентам.

Авторы несут ответственность за то, что материалы публикуются впервые, являются достоверными и оригинальными.

**УДК [02+930](082)**
**ББК 78я43+63.2я42**

**ISBN 978-985-880-719-1**

© ГУ «Центральная научная библиотека имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси», 2025

# СОДЕРЖАНИЕ


Вступительное слово главного редактора 5

БИБЛИОТЕКОВЕДЕНИЕ, БИБЛИОГРАФОВЕДЕНИЕ, КНИГОВЕДЕНИЕ

*Ахремчик М. П.* Учебно-методический комплекс по проектной деятельности научных библиотек как инструмент профессионального развития будущих специалистов научных библиотек 6

*Бабарико-Омельченко В. Б., Воронович С. И., Каракулько Ю. О., Морозова О. А., Петровская А. В., Хальвита Е. С.* Лингвистический инструментарий дескрипторного информационно-поискового языка для индексирования аграрной информации в Белорусской сельскохозяйственной библиотеке 16

*Барма О. А., Политевич Е. Э.* Использование библиотечного медиаконтента в информационно-методическом сопровождении образовательных программ повышения квалификации библиотечных работников 27

*Галковская Ю. Н.* Содержательные аспекты подготовки библиотекарей-библиографов: проблемы и возможности 37

*Кветкина Е. А.* Сущностные характеристики цифрового пространства и инфраструктуры библиотеки в контексте цифровизации информационной сферы 51

*Козленко Е. Ю.* Современные исследовательские интересы в области социокультурной деятельности библиотек 68

*Люцко Н. М.* Проблема квалиметрической оценки деятельности библиотеки учреждения высшего образования в истории мировой науки и практики 77

*Магомедова Н. Г.* Электронный справочно-библиографический аппарат в структуре библиографических ресурсов ВОУНБ им. М. Горького 95

*Переверзева Ю. А.* Архитектура знаний: кластер информационных ресурсов как компонент цифровой инфраструктуры научных библиотек 102

*Пирогова О. В.* Формирование профессиональных компетенций в сфере работы с редкой книгой: образовательный и этический контекст 113

*Фёдорова К. А.* К вопросу о разработке стратегии реализации онлайн-проекта по популяризации фондов библиотек 127

*Юрик И. В.* Управление информацией об исследовательской деятельности: проблемы, модели и компетенции 136

ИСТОРИОГРАФИЯ, ИСТОЧНИКОВЕДЕНИЕ И МЕТОДЫ ИСТОРИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ

*Белявский А. М.* Репрезентации исторической памяти в ирландском кинематографе (на примере художественного фильма «Черный 47-й») 144

*Врублевский В. В.* К вопросу о классификации генеалогических источников Беларуси первой половины XX в. 164

*Горны А. С., Ананька К. Д.* Мікалай Марцінчык (1901–1980) і яго ўспаміны 180

*Губанова О. А.* «Устав о христианском житии» в фондах Центральной научной библиотеки НАН Беларуси 194

*Денисенко Е. П.* Минская губерния в документальных источниках XIX ст. (по фондам Центральной научной библиотеки НАН Беларуси) 205

*Кривицкий М. А.* Старообрядцы Витебской губернии в начале XX в.: толки и согласия, законодательное положение и отношения с православной церковью 218

*Семяненка-Басін І. В., Свістунова М. І.* Эпітафія мучаніку-дзіцяці Гаўрыілу з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва 239

ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЕ ИНИЦИАТИВЫ И ПРОЕКТЫ

*Скворцова О. В., Клементьев А. К.* Книжно-иллюстративная выставка к 175-летию со дня рождения православного издателя-типографа Евфима Ивановича Фесенко (1850–1926) в экспозиционном пространстве библиотеки Российской академии наук 255

ХРОНИКА БИБЛИОТЕЧНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ 268

БИБЛИОГРАФИЯ РАБОТ СОТРУДНИКОВ ЦЕНТРАЛЬНОЙ НАУЧНОЙ БИБЛИОТЕКИ НАН БЕЛАРУСИ ЗА 2025 ГОД 280

НАШИ АВТОРЫ 307

УДК 94(476)
**Горны Аляксандр Сяргеевіч**
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
**Ананька Кірыл Дзмітрыевіч**
Гімназія № 7 імя В. Ц. Калакольнікава г. Гродна

## Мікалай Марцінчык (1901–1980) і яго ўспаміны

У артыкуле на аснове архіўных крыніц і здабыткаў гістарыяграфіі раскрыты асноўныя біяграфічныя звесткі пра дзеяча беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі, аднаго з лідараў Таварыства беларускай школы Мікалая Марцінчыка. У дадатку да артыкула ўпершыню друкуецца адзін з варыянтаў яго ўспамінаў аб грамадскай дзейнасці ў міжваенны перыяд.
*Ключавыя словы:* Мікалай Марцінчык, беларускі нацыянальны рух, Заходняя Беларусь, міжваенная Польшча, Таварыства беларускай школы.

**Горный Александр Сергеевич**
Гродненский государственный университет имени Янки Купалы
**Ананько Кирилл Дмитриевич**
Гимназия № 7 имени В. Т. Колокольникова г. Гродно

## Николай Мартинчик (1901–1980) и его воспоминания

В статье на основе архивных источников и достижений историографии раскрыты основные биографические сведения о деятеле белорусского национально-освободительного движения в межвоенной Западной Беларуси, одном из лидеров Товарищества белорусской школы Николае Мартинчике. В приложении к статье впервые публикуется один из вариантов его воспоминаний об общественной деятельности в межвоенный период.
*Ключевые слов*а: Николай Мартинчик, белорусское национальное движение, Западная Беларусь, межвоенная Польша, Товарищество белорусской школы.

**Gorny A.**
Yanka Kupala State University of Grodno
**Ananka K.**
Gymnasium № 7 named after V.T. Kolokolnikov, Grodno

## Mikalaj Marcinchyk (1901–1980) and His Memoirs

Based on archival sources, the article reveals the main biographical information about the figure of the Belarusian national liberation movement in



pawet.net

interwar Western Belarus, one of the leaders of the Belarusian School Society, Mikalaj Marcinchyk. At the end of the article memoirs about his public activities in the interwar period are printed for the first time. An appendix to the article publishes, for the first time, one of the versions of his memoirs about his public activities in the interwar period.

*Keywords:* Mikalaj Marcinchyk, Belarusian national movement, Western Belarus, interwar Poland, Belarusian School Society.

Беларускі нацыянальны рух у міжваеннай Заходняй Беларусі з’яўляўся прыкметнай гістарычнай з’явай, якая патрабуе глыбокага асэнсавання з боку сучаснага пакалення гісторыкаў. Дзеля правядзення грунтоўных даследаванняў у гэтым накірунку неабходна ўводзіць у навуковы абарот новыя крыніцы, у тым ліку эга-дакументы з сямейных архіваў, што дазволіць больш падрабязна прасачыць чалавечае вымярэнне гістарычных працэсаў, раскрыць раней невядомыя аўтарскія ацэнкі і пазіцыі. У першую чаргу гэта датычыцца мемуараў, на якія гісторыя беларускага руху ў Заходняй Беларусі адносна “небагата”. Лёс некаторых актывістаў гэтага руху быў цяжкім і трагічным, таму яны не паспелі пакінуць разгорнутых успамінаў, альбо пісалі іх “у стол”, асцерагаючыся негатыўнай рэакцыі. Многія з такіх крыніц да сённяшняга часу не ўведзены ў гістарычны наратыў, працягваюць заставацца часткай сямейных збораў і, такім чынам, могуць увогуле знікнуць для гістарычнай навукі. Усё гэта адносіцца і да мемуарнай спадчыны беларускага грамадскага дзеяча, асветніка, лекара Мікалая Марцінчыка (1901–1980), якая толькі пачынае быць даступнай для даследчыкаў.

Асоба Мікалая Марцінчыка сёння вядома толькі вузкаму колу спецыялістаў па гісторыі Заходняй Беларусі. Між тым у міжваенны перыяд ён быў адным з лідараў Таварыства беларускай школы (ТБШ) – масавай беларускай культурна-асветніцкай арганізацыі у тагачаснай Польшчы. Марцінчык зрабіў значны ўклад у захаванне беларусамі сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах палітыкі паланізацыі, быў перакананым беларускім патрыётам, за што некалькі разоў праследаваўся польскімі ўладамі. Яго імя можна было сустрэць побач з такімі вядомымі фігурамі беларускай культуры міжваеннай Заходняй Беларусі, як Рыгор Шырма, Ігнат Дварчанін, Сяргей Паўловіч і інш. У пасляваенны перыяд, калі заходнебеларускі нацыянальна-вызваленчы рух стаў прадметам навуковага аналізу савецкай гістарыяграфіі, даследчыкі рэдка згадвалі імя Марцінчыка ў кантэксце дзейнасці ТБШ, а калі і згадвалі, то неабгрунтавана паўтаралі старыя даваенныя клішэ аб “нацдэмах” і іх шкодніцкай дзейнасці ў шэрагах таварыства [8, с. 138]. У шмат чым такія падыходы прымусілі самога Марцінчыка звярнуцца ў тагачасныя партыйныя структуры з мэтай апраўдаць сваё імя. Гэтыя захады

далі пэўны плён: у 1980 г. ужо да цяжка хворага Марцінчыка прыйшоў прадстаўнік Гродзенскага абкама КПБ і вусна прынёс прабачэнне за неапраўданыя ацэнкі савецкіх гісторыкаў [3, с. 378].

Першыя біяграфічныя звесткі пра М. Марцінчыка і яго грамадскую дзейнасць пачалі з'яўляцца толькі ў часы перабудовы ў гродзенскім перыядычным друку [6]. Неабходна адзначыць значную працу ў гэтым накірунку мясцовага даследчыка гісторыі медыцыны Фёдара Ігнатовіча, які дзякуючы сваім грунтоўным біяграфічным нарысам, фактычна нанова "адкрыў" імя Мікалая Марцінчыка для шырокай грамадскасці [3–5]. Пры гэтым аўтар справядліва падкрэсліваў, што Марцінчык шмат зрабіў для развіцця беларускай культуры ва ўмовах паланізацыі, аднак так і не дачакаўся прызнання сваіх заслуг пры жыцці. Таксама пра гэтага беларускага дзеяча згадвалі ў сваіх працах такія краязнаўцы, як Л. Калеснік, С. Чыгрын, М. Пацэнка і інш. [7, с. 63–67; 12, с. 82–86; 11]. Разам з тым постаць Марцінчыка заслугоўвае асобнай грунтоўнай манаграфіі з асэнсаваннем кантэксту яго жыцця і грамадскай дзейнасці ў міжваенны і пасляваенны перыяды.

Мікалай Марцінчык нарадзіўся 3 снежня 1901 г. у в. Кубельнікі Гродзенскага павета ў сялянскай сям'і. Пасля вяртання з бежанства часоў Першай сусветнай вайны, ён у 1921 г. скончыў у Гродне мясцовую прыватную рэальную гімназію [13, арк. 12]. Менавіта ў гэты перыяд у горадзе назіралася пашырэнне беларускай нацыянальнай актыўнасці, ствараліся розныя беларускія ўстановы і гэта прывяло да знаёмства маладога чалавека з нацыянальным рухам. У тым жа годзе ён паступіў на медыцынскі факультэт Віленскага ўніверсітэта. Ужо ў анкеце на паступленне Марцінчык свядома пазначыў сваю нацыянальнасць як "беларус", а роднай мовай назваў беларускую [13, арк. 59]. Падчас вучобы ва ўніверсітэце малады чалавек далучыўся да дзейнасці Беларускага студэнцкага саюза (БСС), а ў 1924–1925 гг. нават узначальваў гэтую арганізацыю [9, с. 360]. Пры яго ўдзеле БСС пачаў выдаваць уласны часопіс "Студэнцкая думка", была арганізавана бібліятэка і інш.

Па заканчэнні ўніверсітэта ў 1927 г. Мікалай Марцінчык быў пакінуты ардынатарам у педыятрычным аддзяленні ўніверсітэцкай клінікі. Таксама ён меў прыватную практыку, некаторы час працаваў інспектарам (сённяшняя школьная пасада завуча па выхаваўчай працы. – *А. Г., К. А.*) Віленскай беларускай гімназіі, дзе паралельна выкладаў анатомію і гігіену. Неабходна заўважыць, што лекарская праца прыносіла Марцінчыку добры заробак, які ён з большага выдаткоўваў на развіццё беларускай культуры. У прыватнасці вядома, што выдаткі на канцэрты вядомага беларускага спевака Міхася

Забэйды-Суміцкага ў 1930-я гг. пакрываліся непасрэдна Марцінчыкам [3, с. 371].

Яшчэ ў студэнцкія гады Мікалай Марцінчык пачаў актыўна супрацоўнічаць з беларускай прэсай левардыкальнага накірунку ў якасці аднаго з рэдактараў. Гэтая праца дазволіла яму зблізіцца з вядомымі лідарамі беларускага руху ў тагачаснай Заходняй Беларусі. У жніўні 1925 г. ён у якасці адказнага за беларускі друк разам з Браніславам Тарашкевічам прымаў удзел у нарадзе ў Сопаце з прадстаўнікамі КПЗБ і КП(б)Б, на якой было прынята рашэнне аб арганізацыі ў Заходняй Беларусі масавай легальнай партыі – Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) [10, с. 72]. Калі яе арганізацыйныя структуры былі створаны, Марцінчык атрымаў партыйны білет № 5, што сведчыла ўжо на той час аб яго аўтарытэце сярод кіраўніцтва Грамады [3, с. 369]. Пасля разгрому БСРГ польскімі ўладамі ў студзені 1927 г. Марцінчык на некаторы час быў затрыманы і змешчаны ў вядомую Лукішскую турму.

Арганізацыяй, якой Мікалай Марцінчык аддаў большую частку сваёй маладосці, стала Таварыства беларускай школы. У 1926 г., яшчэ з'яўляючыся студэнтам, ён увайшоў у Галоўную ўправу ТБШ у якасці намесніка сакратара [1, с. 100]. Фактычна на працягу наступных дзесяці год Марцінчык прымаў самы актыўны ўдзел у жыцці таварыства: арганізоўваў новыя структурныя адзінкі, наведваў акруговыя ўправы, абараняў актывістаў перад польскімі ўладамі, аказваў фінансавую падтрымку. Менавіта дзякуючы яго захадам доўгі час пратрымалася ці не адна з самых моцных правінцыяльных структур таварыства – беластоцкая акруговая ўправа. У кастрычніку 1930 г. Марцінчык разам з іншым актывістамі ТБШ зноў быў арыштаваны польскімі ўладамі па абвінавачванні ў "камуністычнай дзейнасці", падчас правядзення следства ён некалькі разоў вымушаны быў сядзець у Лукішскай турме. Паводле інфармацыі з тагачасных газет, яго вызвалілі з турмы ў маі 1931 г., хаця следства па справе дзеячаў ТБШ яшчэ вялося [2]. У лютым 1932 г. следчыя дзеянні адносна С. Паўловіча, М. Марцінчыка, Б. Кіта, М. Скурко, І. Біндзюка і шэрагу іншых актывістаў былі спынены ў сувязі з адсутнасцю доказаў іх кантактаў з камуністычным падполлем [14, арк. 165]. Тым не менш польскія ўлады забаранілі Марцінчыку пражываць у Вільні як "нядобранадзейнаму". Ён вымушаны быў уладкавацца сельскім лекарам спачатку ў Ваўкавыскім павеце, а пасля ў вёсцы Нараўка на Падляшшы [3, с. 374].

Верасьнёўскія падзеі 1939 г. Мікалай Марцінчык сустрэў у Нараўцы, вітаючы прыход савецкай улады ў Заходнюю Беларусь. Паводле яго ўспамінаў, ён некалькі разоў выступаў па-беларуску на мітынгах у падтрымку новых улад [7, с. 109]. У часы нямецкай акупацыі Марцінчык у шпіталі ў Нараўцы даглядаў палонных чырвонаармейцаў, за што пераследаваўся з боку

акупантаў [3, с. 374]. Пасля вызвалення Беларусі ў 1944 г. ён разам з сям'ёй пераехаў у Гродна, дзе працаваў лекарам у розных медыцынскіх установах горада.

У 1948 г. Мікалая Марцінчыка беспадстаўна арыштоўваюць і прыгаворваюць да 10 гадоў папраўчых лагераў. Пакаранне адбываў у лагеры ў Варкуце, дзе таксама працаваў лекарам для зняволеных і мясцовага насельніцтва. Быў датэрмінова вызвалены ў 1955 г., цалкам рэабілітаваны 25 снежня 1956 г. Вярнуўся ў Гродна, дзе працаваў у абласной клінічнай бальніцы да выхаду на пенсію ў 1965 г. [3, с. 376]. Пасля вяртання з лагера Марцінчык узнавіў кантакты са старымі дзеячамі беларускага руху, меў перапіску з Зоськай Верас, Міхасём Забэйдам-Суміцкім, Янкам Шутовічам і інш. Значна ўплываў на гродзенскае культурнае асяроддзе 1960–1970-х гг., сустракаючыся з маладымі на той час пісьменнікамі Васілём Быкавым, Аляксеем Карпюком, Данутай Бічэль і інш. Памёр Мікалай Марцінчык у 1980 г., быў пахаваны на могілках аграгарадка Алекшыцы Берастaвіцкага раёна.

У пасляваенны перыяд Мікалай Марцінчык падрыхтаваў некалькі варыянтаў сваіх успамінаў аб грамадскай дзейнасці ў міжваеннай Заходняй Беларусі, якія не ўяўлялі цэласнага мемуарнага комплексу. Адзін з варыянтаў успамінаў быў напісаны аўтарам па просьбе настаўніка Алеся Белакоза і пасля перададзены ў Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей. У 2020 г. гэтыя ўспаміны былі надрукаваны ў кнізе краязнаўца Л. Калесніка [7, с. 107–112]. Акрамя гэтага, Марцінчык падрыхтаваў прынамсі два варыянты сваіх успамінаў для вышэйзгаданага гродзенскага даследчыка гісторыі медыцыны Ф. Ігнатовіча. Рукапісы ўспамінаў захоўваліся ў прыватным архіве гісторыка, аднак пасля яго смерці ў 2016 г. іх лёс на сённяшні час невядомы. Аўтары дадзенага артыкула маюць фотакопію гэтых успамінаў, якая была атрымана ад гісторыка А. Чарнякевіча. Дзеля ўвядзення тэксту дакумента ў навуковы абарот і захавання для далейшых даследаванняў, у дадатку да артыкула друкуецца адзін з варыянтаў мемуараў Марцінчыка з архіва Ф. Ігнатовіча. Намі было прынята рашэнне передрукаваць найбольш змястоўны варыянт успамінаў, бо іншы варыянт фактычна паўтарае інфармацыю першага, не ўтрымліваючы важнай дадатковай інфармацыі. Мемуары рыхтаваліся ў канцы 1970-х гг., пра што сведчыць перапіска Марцінчыка з Ігнатовічам, якая адклалася ў прыватным архіве апошняга. Яны напісаны ад рукі на беларускай мове ў школьным сшытку. Пры передруку быў цалкам захаваны правапіс арыгінала. Словы, у дакладным расшыфроўванні якіх няма абсалютнай пэўнасці, а таксама адноўленыя па сэнсе словы альбо іх часткі, размешчаны ў квадратных дужках.

Успаміны Мікалая Марцінчыка ўтрымліваюць кароткія звесткі аб станаўленні яго як грамадскага дзеяча і лекара, далучэнні да беларускага нацыянальнага руху, удзеле ў выданні беларускіх газет у міжваеннай Вільні, пераследаваннях з боку польскай улады. Асобныя моманты ўспамінаў даюць магчымасць удакладніць наяўныя на сённяшні час біяграфіі аўтара. Найбольш змястоўна адлюстраваны ва ўспамінах сюжэт аб дзейнасці ў рамках Таварыства беларускай школы і спробах захаваць таварыства як легальную арганізацыю. Аўтарам успамінаў дадзены некаторыя ацэнкі працы вядомых дзеячаў ТБШ, такіх як, напрыклад, Ф. Стэцкевіч, Р. Шырма і інш. У цэлым успаміны пашыраюць наша ўяўленне аб складаных працэсах захавання беларускай ідэнтычнасці ў Заходняй Беларусі і значна дапаўняюць вядомыя на сённяшні час дакументальныя крыніцы (дадатак).

ДАДАТАК

## Успаміны

Радзіўся я не 6 (па-пашпарту), а 3 (фактычна) снежня 1901 года ў в. Кубельнікі, Багародзіцкай воласці, Горадзенскага пав[ета], Горадзенскай губ[ерні], а цяпер Алекшыцкага сел[ьскага] савета, Бераставіцкага р-на, Горадзенскай вобласці. У пачатковую школу пачаў хадзіць у Масалянах, дзе была і воласць.

У часе 1-ай сусветнай вайны я з бацькамі выехалі ў 1915 г. у бежанства ў Расію, дзе пражывалі ў г. Чыстапалі, Казанскай губ[ерні]. У Чыстапалі падгатовіўшысь паступіў у 3-ці клас мужчынскай гімназіі. Ужо ў расейскай гімназіі вучыцелька рускай славеснасці расказала, што ёсць тры мовы: руская, украінская і беларуская. Дала прыклад "мама": па-рускі ў клічным склоне будзе "мама", па-украінску "мамо" і па-беларуску "маму". Гэта мне ў маёй маладой памяці моцна засела.

У нас у хаці заўсёды гутарылі па-беларуску. І я хоць і трэба было вучыцца па-руску, я заўсёды гутарыў у хаці толькі па-беларуску. З малку да самай старасці – ўсё жыццё.

У 1919 годзе ўвосені мы вярнуліся на бацькаўшчыну. Вёска была спалена, засталася толькі хата – холад і голад. У цяжкіх умовах у Горадні я падгатовіўся і паступіў ў апошні клас прыватнай гімназіі, якую і кончыў – на рускай мове. Ужо ў Горадні была беларуская дзейнасць – беларускі нац[ыянальны] камітэт[1], беларуская гімназія[2] – пачатковыя класы, але я нікога не знаў і ніякай дзейнасці не прымаў.

---

[1] Беларускі нацыянальны камітэт (БНК) у Гродне – прадстаўнічы орган беларускіх нацыянальных арганізацый Гродзеншчыны, які дзейнічаў у 1918–1921 гг.

[2] Гродзенская беларуская гімназія – беларуская сярэдняя навучальная ўстанова, існавала ў г. Гродна з лістапада 1920 г. па жнівень 1921 г.

У 1921 годзе паступіў у Віленскі Унівэрсытэт на медыцынскі факультэт, які скончыў у 1927 годзе. У Вільні ў пачатку двадцатых гадоў увесь нацыянальны рух беларускі канцэнтраваўся на вул. Віленскай № 12. Там мясцілася “Школьная Рада”[3] (пасля Таварыства беларускай школы[4]), там мясцілася рэдакцыя ўсіх радыкальных беларускіх газэт, там мясціўся і Студэнскі Саюз беларускі[5].

Тады было цікавае беларускае жыцце: усё развівалася, бурліла. І ў студэнскім саюзе жыцце пачынала, набірала свае формы, нараджваліся, меркавалі, спрачаліся. У Школьнай Радзе ішла барадзьба за беларускія школы, бо палякі зачылі[6] амаль усе школы раней адчыненыя пры Савецкім урадзе ў Беларуска-Літоускай Савецкай Рэспубліцэ[7] і тыя, якія былі адчынены ў часе сусветнай вайны там дзе было беларускае насельніцтва больш нацыянальна свядомае, дзе ў “начальных народных училищах” працавалі настаўнікамі свядомыя беларусы былі ператвораны у беларускія школы. Такіх усіх школ было больш 500.

Польскі урад усе гэтыя школы зачыняў. Трэба было бараніць, каб не дапусціць да зачынення беларускіх школ, а наадварот адчыняць новыя беларускія школы. Для гэтай барацьбы патрэбна была прэса, рэдакцыя якой – да рэчы – і знаходзілася у гэтым-жа самым будынку, дзе мясцілася і Школьная Рада і Беларускі Студэнцкі Саюз. Прэса – беларускія газэты, адозвы і журналы, адміністрацыя якіх знаходзілася на Віленскай 12 заўсёды мела характар нацыянальна-дэмакратычны, радыкальны. Іначай і быць не магло: яна бараніла беларускія працоўныя масы, яна змагалася за беларускія школы, яна выяўляла злачынствы польскай буржуазна-абшарніцкай улады і вучыла беларускія працоўныя масы як змагацца з гэтай панскай навалай. У адміністрацыю прыходзіла многа пісем, скаргаў аб усіх гэтых панскіх крыўдах, здзеках. З часам карэспандэнцыя была такая колькасна і якасна ўсё хапляла, што адміністрацыя ня мела магчымасці нават адказаць карэспандэнтам на паступаючыя пісьма-скаргі. А трэба было нікаторыя

---

[3] Маецца на ўвазе Цэнтральная беларуская школьная рада – выканаўчы орган Таварыства беларускай школы (ТБШ) у 1921–1926 гг. У 1926 г., пасля рэарганізацыі таварыства, была пераўтворана ў Галоўную ўправу ТБШ.

[4] Таварыства беларускай школы (ТБШ) – культурна-асветніцкая арганізацыя ў Заходняй Беларусі ў 1921–1936 гг., мэтай якой з’яўлялася пашырэнне беларускай мовы, культуры і адукацыі шляхам адкрыцця культурна-адукацыйных устаноў і арганізацыі шматлікіх гурткоў. Па стане на 1930 г. у Заходняй Беларусі існавала больш за 500 гурткоў колькасцю ад 15 да 30 тыс. чалавек.

[5] Беларускі студэнцкі саюз (БСС) – арганізацыя беларускіх студэнтаў у 1920–1939 гг., якая дзейнічала ва Універсітэце Стэфана Баторыя ў Вільні. Першапачаткова вядомы як «Гурток студэнтаў беларусаў». Галоўнай мэтай з’яўлялася выхаванне нацыянальнай самасвядомасці ў насельніцтва Заходняй Беларусі.

[6] Так у тэксце, напэўна, маецца на ўвазе “зачынілі”.

[7] Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (Літбел) – савецкая дзяржава, створаная ў лютым 1919 г. падчас польска-савецкай вайны на занятых Чырвонай арміяй тэрыторыях сучаснай Беларусі і Літвы. Праіснавала да ліпеня 1919 г.

пісьма-матэрыялы выкарыстаць у газэце – апрацаваць іх. Я цікавіўся карэспандэнцыяй, цікавіуся беларускім паднявольным у абшарніцкай Польшчы жыццём беларускіх працоўных масаў.

Адміністрацыя газэт прасіла мяне пры навале працы ў карэспандэнцкім аддзеле разабрацца ў гэтай шматлікай сувязі сялянскай беларускай інтэлігенцыі з сваёй прэсай. Так я стаў працаваць, як сталы супрацоўнік беларускіх радыкальных газэт, дзе працаваў усе двадцатыя гады – у часы нацыянальна-вызваленчага, рэвалюцыянізуючага беларускага руху. Польскі буржуазны урад хацеў сцерці з твару зямлі беларускі народ – спалянізаваць яго. А ведаючы, што бедната лягчэй паддаецца палянізацыі, польскія багачы душылі беларусаў матэрыяльна.

Трэба было, выкарыстоўваючы матэрыял караспанцыяў[8], выкрываць усё больш і больш пляны абшарніцкага польскага ураду і заклікаць беларусаў да барацьбы з матэрыяльным уціскам і з мэтадамі нацыянальнага уціску: з зачыняннем беларускіх школ і надварот, змагацца за адчыненне новых беларускіх школ. Беларуская "школьная Рада", а пасля "Таварыств[а] беларускае школы" вяла тую-ж самую работу – барацьба за беларускую школу.

Трэба было выяжджаць на правінцыю ў справах шк[о]лы беларускай. Такім чынам праца ў радыкальных газэтах перапляталася з працай у Т-ве Беларускае Школы. Прышлося быць сталым супрацоўнікам і ў радыкальных газэтах і ў Т-ве Беларускай Школы. Стала выбіралі мяне ў Галоўную Управу Т-ва Беларускай школы. Ішлі гады. Беларускі радыкальны нацыянальна вызваленчы рух шырыўся і мацнеў.

Была створана Беларуская Сялянска-работніцкая Грамада[9], якая разраслася да 120.000 сяброў. Польскі ўрад спалохаўся і ліквідаваў "Грамаду". У начы з 14 на 15 студзеня 1927 года былі праведзены навальныя арышты кіраўнікоў "Грамады". Адначасна быў арыштаваны і я, але мяне хутка выпусцілі, бо пры вобыску у мяне нічога кампрамітуючаго не знайшлі а галоўныя шпікі-дэфэнзыўшчыкі мяне ў твар не зналі.

У гэты час я толькі-што атрымаў абсолюторыя па медыцыне ў унівэрсітэце. Выйшаўшы з турмы я адразу узяўся за навуку, каб як мага хутчэй здаць дзяржаўныя экзамены для атрымання дыплёму доктара. У працягу паўгада я здаў усе экзамены і атрымаў тытул "Doctor Medicinae universae".

---

[8] Так у тэксце, правільна будзе "карэспандэнцый".

[9] Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ) – палітычная арганізацыя ў Заходняй Беларусі левaрадыкальнага накірунку. Створана ў 1926 г. на аснове аднайменнай фракцыі ў польскім парламенце. Па розных падліках у склад арганізацыі уваходзіла ад 100 да 150 тыс. членаў. 21 сакавіка 1927 г. польскія ўлады афіцыйна забаранілі дзейнасць БСРГ.

Пры разгроме "Грамады" пракаціліся масавыя арышты і тады рады культурных работніках моцна парадзелі.

Не хапала работнікаў у Віленскай Беларускай Гімназіі[10]. Галоўная Управа Т-ва Беларускае Школы мне запрапанавала пайсці на працу ў Віленс. Беларус. Гімназію інспэктарам і выкладчыкам гігіены і анатоміі. Я спачатку супраціўляўся. Будучы доктарам, маючы вольную і свабодную прафэсію і пайсці на цяжкую і небяспечную працу ў такія цяжкія часы. Доўга думаў і перадумваў. У канцы канцоў рашыў: а хто-ж пойдзе, як не такія, як я, атрымаўшыя вышэйшую асвету ў гэтыя цяжкія часы пагрому беларускага руху. Каб пасля ня думаці… "хто пайшоў, а тым здрадзіў, хай дрыжыць, у дзень прысуду, я сведчыць буду".

І пасля роздуму пайшоў на гэтую работу. Праца ў Віленс[кай] Беларускай гімназіі была цяжкай і небяспечнай, сытуацыя напружанай. Большай часткі вучняў бацькі або блізкія сваякі былі ў часе разгрому Грамады былі арыштаваны. Вучні былі абураны проці польскай, акупацыйнай улады, кожную хвіліну гатовы пайсці на бунт, пратэст.

А тут як раз у лютым 1928 года пачаўся ў віленскім акружным судзе працэс проці галоуных кіраўнікоў "Грамады". Вучні абурыліся і рашылі выразіць пратэст проці акупацыйнай улады за праследаванне і [з]нішчэнне беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Я, як інспэктар гімназіі быў у добрых адносінах з вучнямі і ведаў, што кіраўніком проэстуючаго вучнеўскага руху быў Язэп Урбановіч[11].

Я. Урбановіч паведаміў мяне, што на другі дзень мае адбыцца дэманстрацыя пратэсту ў гімназіі проці суда над "Грамадой" і проці акупацыйнага ураду на Заходняй Беларусі. Мы дагаварыліся з Я. Урбановічам, што ўсе адбудзецца ў памяшчэнні гімназіі, не выходзячы на вуліцу і лекцыяў полёністаў Віслауха[12] і Александровіча[13], якія былі вачыма і вушамі "дэфэнзывы"[14] "зрываць" ня будзем, а на іншыя лекцыі вучні ня

---

[10] Віленская беларуская гімназія (ВБГ) – беларуская навучальная ўстанова, якая існавала з 1919 па 1944 г. у Вільні. Фактычна з'яўлялася галоўным вучэбна-метадычным цэнтрам сярэдняй адукацыі для беларускага насельніцтва на тэрыторыі міжваеннай Заходняй Беларусі.

[11] Язэп Паўлавіч Урбановіч (1907–1944) – беларускі грамадска-палітычны дзеяч. Падчас навучання ў ВБГ арганізоўваў і ўзначальваў камсамольскія ячэйкі. З 1928 г. актыўна ўдзельнічаў у дзейнасці КПЗБ. У гады Вялікай Айчыннай вайны стаў арганізатарам антыфашысцкай падпольнай арганізацыі на Берасцейшчыне, быў вядомы пад псеўданімам Максім. Летам 1943 г. узначальваў партызанскую брыгаду імя П. К. Панамарэнкі.

[12] Севярын Віславух (1900–1968) – польска-беларускі гісторык, грамадскі дзеяч, педагог. Выкладаў гісторыю Польшчы ў ВБГ. Вывучаў гісторыю Вялікага Княства Літоўскага і сацыяльна-палітычныя працэсы ў Заходняй Беларусі.

[13] Магчыма, маецца на ўвазе Марыя Александровіч – настаўніца польскай мовы ў ВБГ. Па ўспамінах былога вучня Леаніда Галяка, яна была жонкай аднаго з функцыянераў аддзела бяспекі Віленскага ваяводства. Маці гісторыка Станіслава Александровіча.

[14] Дэфензіва – паліцэйскі орган у міжваеннай Польшчы, які выконваў ролю палітычнай паліцыі і займаўся контрразведвальнай дзейнасцю.

пойдуць і прымуць удзел у дэманстрацыі, прамауляць проці урада. Вучыцялеў, якім я давяраў я ад[правіў] дамоў пад відам, што яны захва[рэлі]. Калі хто пытаў дзе вучыцялі, ка[заў], што яны захварэлі.

Дырэктар С. Паўловіч[15] працаваў у канцылярыі і нічаго "ня ведаў", што робіцца ў гімназіі. Забастоўка п[р]айшла ціха. Ніхто нічога не ведаў.

[кавалак тэкста выразаны][16]

Праўдай з'яўляецца той факт, [што] ў 1927 годзе ў верасні С. К. Паўловіч быў зацьверджаны] дырэктарам, а я быў зацьверджаны] інспектарам Віл. Бел. Гімназіі. У 1928 годзе ў верасні я ня быў зацьверджаны інспектарам і вучыцелем Віл[енскай] Бел[арускай] Гімназіі, а С. К. Паўловіч ня быў зацьверджаны дырэктарам Віл[енскай] Бел[арускай] Гімназіі.

У Віл[енскую] Беларускую Гімназію прыслалі Астроўскага[17].

Я і надалей заставаўся сябром Галоўнай Управы Т-ва Беларускай школы. Трэба было змагацца за народную беларускую школу; трэба было змагацца з беззаконнымі дзеяннямі польскіх урадоуцаў, адкідаць усе закіды панскай адміністрацыі, якія яны стасавалі да гурткоў Т-ва Бел. Школы і беларускіх культурных работнікаў.

Трэба было хадзіць да віленсскага ваяводы. Зазвычай хадзілі ў такім складзе: Ф. Стэцкевіч[18], Р. Шырма[19] і я.

Старшыня Галоўнае Управы Т.Б.Ш. – як юрыст усе законна, з юрыдычнага боку абгрунтоўваў нашы беларускія правы і незаконныя дзеянні панскай буржуазнай адміністрацыі. Адзін недахоп быў у Ф. Стэцкевіча: яго недастаткова бадзёрая, трохі млявая вымова, якая мала падчырквала бяззаконне таго гвалту, які чынілі над намі паны. Р. Шырма ўсяго баяўся, ён ніколі рашуча ня мог выступіць за нашы законныя правы, у яго з'яўляўся перхатлівы кашаль, як бы свечачы аб яго няпэўнасці таго, што ён казаў.

Прыходзілася мне больш рашуча сказаць праўду і больш рашуча патрабаваць сваіх правоў – што я і рабіў. Я быў незалежны – вольны лекар. Працаваў тады я ў дзіцячай клініцы, у амбулаторыі апекі над мацярай і

---

[15] Сяргей Канстанцінавіч Паўловіч (1875–1940) – беларускі грамадска-культурны дзеяч, педагог, публіцыст. Адзін з кіраўнікоў ТБШ. Выкладаў праваслаўны Закон Божы ў ВБГ, выконваў абавязкі яе дырэктара 1927–1928 гг. Зрабіў вялікі ўклад у развіццё беларускага асветніцтва ў Заходняй Беларусі.

[16] У дадзеным месцы частка тэксту ўспамінаў выразана, верагодна, самім аўтарам.

[17] Радаслаў Казіміравіч Астроўскі (1887–1976) – беларускі грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст, педагог. У 1924–1936 гг. займаў пасаду дырэктара ВБГ, дзе выкладаў матэматыку, фізіку і астраномію. Знаходзіўся ў складзе кіраўніцтва ТБШ і БСРГ. Пасля 1928 г. заняў паланафільскую пазіцыю ў грамадска-палітычных справах.

[18] Фелікс Іванавіч Стацкевіч (1879–1967) – беларускі грамадска-палітычны дзеяч, педагог. Займаў пасаду старшыні Галоўнай управы ТБШ, дырэктара Радашковіцкай беларускай гімназіі, з 1928 г. працаваў у ВБГ, выкладаў лацінскую мову.

[19] Рыгор Раманавіч Шырма (1892–1978) – беларускі грамадскі дзеяч, кампазітар, педагог, публіцыст. Адзін з кіраўнікоў ТБШ, займаў пасаду сакратара Галоўнай управы. У ВБГ выкладаў спевы і быў выхавацелем у гімназічным інтэрнаце. Падтрымліваў вучнёўскі левaрадыкальны рух у сценах гімназіі, за што і быў звольнены польскімі ўладамі ў 1928 г.

дзецем, у літоўскай бальніцы і хуткай дапамозе. І таму трымаў сябе ў адносінах да улады на законных правах, але ня гнуў перад панамі карку.

Ваявода Кірцікліс[20] хацеў мяне пер[а]цягнуць на свой бок і перадаў мне праз Віслауха, якога я знаў з універсітэцкіх часоў, каб я зайшоў да Кірцікліса пагутарыць. Пры тым ён зазначыў, што ён не патрабуе ад мяне ніякай згоды на супрацоўніцтва. Кірціклiс, відаць, усё ведаў пра мяне, што магла ведаць дэфэнзіва, бо ён перад пасадай ваяводы быў начальнікам ваеводзкай бяспекі ў Вільні.

І, запрашаючы мяне на перагаворы з ім, ён не разлічваў, што я пайду на "угоду" з акупацыйнай польскай уладай. Але ён не разлічваў, калі я спаткаюся з ім, што самым фактам спаткання мяне з прадстаўнікам польскага фашыстоускага ураду скампрамітую сябе, што кіну на сябе пляму спробы дамовіцца з панамі і стацца здраднікам беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Таму я на запросіны мяне спаткацца з ваяводай Кірціклісам адказаў коратка: "Мне няма аб чым гутарыць з ваяводай Кірціклісам". Як адказ на гэта я быў хутка арыштаваны.

Тады былі арыштаваны сябры Галоўнае управы ТБШ: старшыня Ф. І. Стэцкевіч, Паўловіч С. К., М. І. Петкевіч[21], Шырма Р. Р. Пратрымалі нас бяз следзтва чуць нягод і выпусцілі.

Пазней за ўсіх выпусцілі мяне. А выпусціўшы выслалі мяне з Вільні. Гэта было ў 1931 годзе.

Тады, будучы высланым з Вільні, я заняўся прыватна лекарскай практыкай, арпача таго працаваў у "Kasie chorych"[22] лясных рабочых у Белавескай пушчы.

Тады ў Польшчы было мала лекараў і можна было многа працаваць і днём і ноччу. Я зарабляў многа грошай. Хапала мне на шырокія жыццевыя і грамадзкія патрэбы, як наймы і аплата залы для канцэрта ў Беластоку Міхася Забэйды[23] з Варшавы, як помач Галоўнай Управе ТБШ – праз рукі Р. Шырмы – хапала мне, каб "замазаць вочы" і "заткнуць вушы" паліцыі, каб

---

[20] Стэфан Кірціклiс (1890–1951) – польскі палітычны дзеяч. У 1927–1928 гг. з'яўляўся начальнікам аддзела бяспекі ваяводскага ўпраўлення ў Вільні. У 1928–1930 гг. выконваў абавязкі намесніка віленскага ваяводы, а ў 1930–1931 гг. займаў пасаду віленскага ваяводы.

[21] Міхаіл Пяткевіч (?–1946) – беларускі грамадска-палітычны дзеяч у Заходняй Беларусі. Уваходзіў у склад Галоўнай управы ТБШ, выкладаў у ВБГ.

[22] Бальнічныя касы ("Kasy chorych") – фінансава-страхавыя ўстановы ў міжваеннай Польшчы, якія займаліся забеспячэннем фінансавання медыцынскай дапамогі іх членам.

[23] Міхаіл Іванавіч Забэйда-Суміцкі (1900–1981) – беларускі оперны спявак, педагог. Пасля Першай сусветнай вайны працаваў у Сібіры, з 1932 г. – у Італіі. У 1935 г. пераехаў у Польшчу, дзе актыўна гастраляваў па гарадах Заходняй Беларусі. У другой палове 1930-х гг. выступаў з прэзентацыямі беларускага фальклорнага рэпертуару.

яна ня бачыла і ня чула, як я выяжджаў у Вільню ці ў Беласток у справе ТБШ, а часамі і у Варшаву да Міхася Забэйды ці ў іншых арганізацыйных справах.

Праследаванне Т.Б.Ш. не спынялася, гурткі зачыняліся – ішоў разгром.

У 1932 годзе быў назначаны акружны з’езд Таварыства Беларускае Школы у Беластоку. Сытуацыя была напружана. У Беласток разам з ваяводай Кірціклісам быў пераведзены з Вільні начальнікам бяспекі Вісокінскі, які добра разбіраўся ў справах Таварыства Беларускай Школы.

Мэта Вісакінскага была – зачыніць акружную Управу ў Беластоку. Трэба было выслаць прадстаўніка Галоўнай Управы.

Ніхто не рашаўся ўступаць у адзінаборства з Вісокінскім.

Рашылі направіць мяне.

На акружным з’ездзе Т.Б.Ш. начальнік беластоцкай бяспекі пачаў ставіць правакацыйныя пытанні адносна дзейнасці акружной Управы ТБШ у Беластоку. Я бараніў Бел[астоцкую] Управу ТБШ як мог, выгароджваючы дзейнасць тэбэшоўцаў у Беластоку, каб не даць повуду дэфэнзыве зачыніць Беластоцкую акружную Управу.

Удалося абараніцца і управа ТБШ у Беластоку ня была зачынена.

Прайшоў год і ўсё было спакойна. А ў 1933 годзе ў Бел[арускай] Сав[ецкай] Рэспубліцы – у Мінску – зваліся неапраўданыя рэпрэсіі на быўшых паслоу Беларускай Сялянска-Работ[ніцкай] Грамады і паслоў “Змагання”[24], знаходзячыся ў Б.С.С.Р. Пасля гэтых падзей у Мінску пачалося ганенне і на мяне за тое, што быццам я неправільна правёў вышай памянуты з’езд у Беластоку, што я за супрацоўніцтва [з] Бел[арускімі] хадэкамі[25]. Я адказаў вялікім адкрытым пісьмом у радыкальную газэту “Беларуская Газэта”[26]. Усё роўна нападкі на мяне, а разам і на Фел[ікса] Іван[авіча] Стэцкевіча ня уніжаліся. Тады Галоўная Управа Таварыства Беларускае Школы склікала паседжанне Галоўнае Управы Таварыства Беларускае школы, на якім прызнала, што дзеянні мае на з’ездзе ТБШ ў Беластоку было правільным. Бо заўсёды ўсе з’езды так і праводзіліся, каб не пайсці на правакацы[і] дэфэнзівы і захаваць Таварыства Беларускае Школы.

У адказ на пастанову Галоунае Управы левацкая група з “Беларускай Газэты” ўсю Галоўную Управу назвала здраднікамі.

---

[24] Беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клуб «Змаганне» – беларуская дэпутацкая фракцыя у польскім сойме ў 1928–1930 гг., у якую ўвайшлі І. Дварчанін, І. Гаўрылік, Ф. Валынец, І. Грэцкі і інш. У сваёй дзейнасці арганізацыя прытрымлівалася левaрадыкальных пазіцый, а таксама адлюстроўвала некаторыя палажэнні з праграмы былой БСРГ.

[25] Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) – беларуская нацыянальна-дэмакратычная партыя. Адным з кіраўнікоў партыі з’яўляўся ксёндз Адам Станкевіч – беларускі рэлігійны дзеяч, педагог, выкладчык ВБГ. У 1936 г. БХД была пераўтворана ў Беларускае нацыянальнае аб’яднанне.

[26] “Беларуская Газэта” – беларуская легальная газета, якая выдавалася два разы на месяц у Вільні ў 1933–1934 гг. Асвятляла грамадска-палітычныя падзеі ў Заходняй Беларусі. З’ўлялася неафіцыйным друкаваным органам КПЗБ.

~~Гэтыя валатузны цягнуліся доўга~~[27]

Левацкая газэта “Беларуская Газэта” № 3 (17) 1934 году выказалася, што Галоўная Управа вядзе ~~палітыку~~[28] і “бароніць палітыку выкрытых цяпер Дварчанінаў[29] і Рак-Міхайлоускіх[30]”.

Вось дзе сабака зарыта.

Вось дзе прычына гэтага фальшавання.

Прайшло пару гадоў і у 1936 левая группа беларускага радыкальнага напрамку згадзілася, каб Таварыства Беларускае Школы ўвайшло ў кантакт з Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры[31], які быў пад кіраўніцтвам хадэкаў, і была дасягнута згода аб супольным правядзенні кампаніі за беларускую школу. Праца ізноў ажыла, народ узварухнуўся, пасыпаліся да ўладаў дэкларацыі з дамаганнем адчынення школ у роднай мове. Нягледзячы на гэты польскі урад узяў курс на ліквідацыю ТБШ, якое у 1937 г. зачынена.

М. Марцінчык

**Список использованных источников и литературы:**


1. Беларускі календар на 1927 год. – Вільня : Друк. Б. Клецкіна, [1926]. – 109 с.
2. З беларускага жыцьця // Беларуская крыніца. – 1931. – № 18. – С. 1.
3. Ігнатовіч, Ф. Гарадзенец Мікалай Марцінчык (1901–1980): лёс беларускага асветніка / Ф. Ігнатовіч // Гарадзенскі палімпсест 2012. Людзі даўняй Гародні, XV – XX стст. / пад рэд. А. Ф. Смалянчука, Н. У. Сліж. – Гродна : Гарадзен. б-ка, 2013. – С. 368–379.
4. Ігнатовіч, Ф. І. Прызнання не дачакаўся / Ф. І. Ігнатовіч // Літаратура і мастацтва. – 1993. – 27 жн. – С. 4.
5. Игнатович, Ф. Страдал за идею / Ф. Игнатович // Биржа информации. – 2002. – 27 июня. – С. 6.
6. Игнатович, Ф. Тернистый путь доктора Мартинчика / Ф. Игнатович, С. Островцов // Гродненская правда. – 1989. – 25 июля. – С. 2.
7. Калеснік, Л. Р. Ад Алекшыц да Эйсмантаў: час, прастора, лёсы / Л. Р. Калеснік. – Мн. : Колорград, 2020. – 272 с.
8. Ладысеў, У. Ф. КПЗБ – арганізатар барацьбы працоўных за дэмакратычныя правы і свабоды (1934–1938 гг.) / У. Ф. Ладысеў. – Мн. : Выд-ва БДУ, 1976. – 167 с.


---

[27] Закрэслена аўтарам.

[28] Закрэслена аўтарам.

[29] Ігнат Сымонавіч Дварчанін (1895–1937) – беларускі грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст, літаратуразнавец, педагог. У першай палове 1920-х гг. удзельнічаў у беларускай культурна-асветніцкай дзейнасці ў Латвіі і Чэхаславакіі. Быў членам ТБШ і БСРГ. Выкладаў беларускую літаратуру ў ВБГ. Аўтар выдання «Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры (ад 1905 года)».

[30] Сымон Аляксандравіч Рак-Міхайлоўскі (1885–1938) – беларускі грамадска-палітычны дзеяч, педагог. У 1922–1927 гг. з'яўляўся паслом І кадэнцыі польскага сойма. Стаяў ля вытокаў стварэння БСРГ. Працаваў у Гродзенскай беларускай гімназіі, выкладаў матэматыку ў ВБГ.

[31] Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК) – беларуская культурна-асветніцкая арганізацыя ў Заходняй Беларусі, створаная ў 1926 г. намаганнямі БХД і Беларускага сялянскага саюза. Галоўнай мэтай стала арганізацыя культурна-асветніцкай працы ў сельскай мясцовасці, таму асноўным кантынгентам арганізацыі сталі сяляне. У сярэдзіне 1930-х гг. налічвалася каля 80 гурткоў. У гэты ж час адбывалася актыўнае супрацоўніцтва з ТБШ. У пачатку 1936 г. польскія ўлады забаранілі дзейнасць арганізацыі.

9. Ляхоўскі, У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў: чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.) / У. Ляхоўскі. – Беласток : Бел. гіст. т-ва ; Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2012. – 483 с.
10. Орехво, Н. С. Дела и люди КПЗБ : воспоминания / Н. С. Орехво. – Мн. : Беларусь, 1983. – 287 с.
11. Пацэнка, М. Бераставічанін Мікалай Марцінчык – «Доктар усёй медыцыны» / М. Пацэнка // Бераставіцкая газета. – 2012. – 20 жн. – С. 8.
12. Чыгрын, С. Час спагадлівым не бывае : гіст.-краязн. і літаратуразн. арт. / С. Чыгрын. – Мн. : Кнігазбор, 2016. – 144 с.
13. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 175. Ap. 3 (IXD). B. 211.
14. LCVA. – F. 131. Ap. 2. B. 1281.

*Дата поступления статьи:* 30.06.2025.